# НАВУЧАННЕ ПЕРАКАЗУ Ў СІСТЭМЕ ЎРОКАЎ ПА РАЗВІЦЦІ МАЎЛЕННЯ

Паўсцяная Вольга Леанідаўна

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаецца пытанне рэалізацыі мэты сучаснай моўнай адукацыі ў фарміраванні моўнай асобы вучня, здольнай карыстацца мовай для паўнавартасных зносін, пазнання і самаразвіцця. У змесце артыкула звяртаецца ўвага на супярэчнасці, якія ўзнікаюць у час педагагічнай практыкі: паміж мэтамі навучання і запатрабаваннямі грамадства, вучняў; паміж адсутнасцю матывацыі да вывучэння беларускай мовы і патрабаваннямі праграмы, стандартаў; паміж імкненнем кожнага вучня да самаразвіцця і недасканалымі формамі навучання. Пры арганізацыі працы па развіцці маўлення вучняў і праектаванні ўрокаў па навучанні пераказу мэтазгодна абапірацца на камунікатыўны метад навучання, выкарыстоўваць эфектыўныя псіхолага-педагагічных прыёмы. У артыкуле змяшчаецца распрацоўка ўрока беларускай мовы ў VI класе па тэме „Падрабязны пісьмовы пераказ “Клён” па складаным плане“.*

Рэалізацыя агульных мэт адукацыі, вызначаных у Адукацыйных стандартах базавай і агульнай сярэдняй адукацый [1], ператварыла метадычныя практыкі, разам з адукацыйнымі і інфармацыйнымі, у дамінуючыя.

Стратэгічная мэта моўнай адукацыі бачыцца ў фарміраванні моўнай асобы, здольнай карыстацца мовай для паўнавартасных зносін і пазнання рэчаіснасці, свайго ўнутранага свету, для інтэлектуальнага і этнакультурнага развіцця.

Аднак прэдыктарам асобаснага станаўлення сённяшняй моладзі з’яўляецца дасягненне поспеху ў жыцці, таму пасля заканчэння навучання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацый хлопцы і дзяўчаты выбіраюць найкарацейшы шлях — стаць запатрабаваным вузкагаліновым спецыялістам, пры гэтым абмінаючы высвятленне і ацэньванне ўзроўню сваёй моўна-камунікатыўнай кампетэнцыі. Сучасны інфармацыйны кантэнт (сеціва, рэклама, сацыяльныя сеткі і інш.) не працуе на зваротную сувязь паміж суразмоўцамі, пазбаўляе людзей звычайных зносін вочы ў вочы, эмоцыя на эмоцыю, не дае мажлівасці фарміраваць, развіваць маўленне і фактычна не патрабуе ад пакалення NEXT валодаць камунікатыўнымі навыкамі і ўменнямі — граматна, правільна весці дыялог, дыскусію, выкладаць у вуснай ці пісьмовай форме свае думкі, доказна, аргументавана, з прыкладамі.

Настаўнік-філолаг трапляе ў складаную метадычную сітуацыю: *для чаго вучыць* і *як вучыць*? Па-першае, неабходна давесці вучням важную думку пра тое, што без мовы, без слоў, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у стварэнні маўленчай плыні, не ажыццяўляецца суразмоўніцтва, перамоў і наладжвання кантактаў, ужо не кажучы пра складанне і вядзенне пэўных дзелавых папер, ліставання; што любая інфармацыя — гэта тэкст, і яго трэба ўмець, па-першае, успрымаць, па-другое, асэнсоўваць і, канечне, ствараць уласны. І каб цябе зразумелі, маўленне павінна быць граматным, лагічным, дакладным.

Па-другое, трэба арганізаваць працэс навучання па авалоданні вучнямі зместам адукацыйнай праграмы, стварыўшы ўмовы для актыўнай пазнавальнай дзейнасці. Асноўныя падыходы і прынцыпы методыкі навучання беларускай мове, сучасныя адукацыйныя тэхналогіі і педагагічны вопыт даюць педагогу мажлівасць арганізаваць эфектыўнае навучанне.

Нягледзячы на тое, што пытанне аб развіцці маўлення вучняў стаіць з даўніх часоў, яно не новае, сучасны стан працы на ўроках беларускай мовы паказвае: найперш патрэбна арганізаваць працу па развіцці маўлення. Яшчэ Якуб Колас зазначаў, што развіваць мову асобна ад думкі немагчыма: „Слова — дзеяльны супрацоўнік нашай думкі. Вялікі запас слоў – адна з умоў для больш дакладнага і яснага выказвання нашай думкі. Адгэтуль развіццё вуснай мовы ёсць і развіццё аднае з прылад нашага мыслення“ [3, с. 207].

Самым пашыраным і, відавочна, важным прыёмам развіцця маўлення ў школьнай практыцы з’яўляецца пераказ [4]. Слова *пераказ* утворана ад дзеяслова *пераказаць*, якому прыстаўка перанадае значэнне „паўторна, нанава ажыццявіць дзеянне“, у нашым выпадку — паўторна, нанава казаць. На вучэбных занятках па навучанні пераказу настаўнік выступае як арганізатар працы над зместам і структурай тэксту. Яго мэта — стварыць умовы для поўнага асэнсавання і паспяховага ўзнаўлення тэксту вучнямі. Прамежкавымі вынікамі дзейнасці вучняў стануць складанне плана і сам план. Канчатковым вынікам — пісьмовая або вусная перадача пачутага ці прачытанага тэксту. Паралельна наладжваецца і праводзіцца работа з вучнямі па аналізе тэксту і яго моўным разборы: тлумачэнні аўтарскіх маўленчых сродкаў, выдзяленні канкрэтных лексічных, марфалагічных, сінтаксічных сродкаў, якія выклікаюць цяжкасці ў вучняў або нясуць

асноўную „нагрузку“ ў перадачы сэнсу. Калі моўны аналіз тэксту праводзіцца настаўнікам сістэматычна, то вучні прызвычайваюцца свядома падыходзіць да выбару моўных сродкаў для стварэння ўласных тэкстаў.

Пры арганізацыі працы па развіцці маўлення вучняў мэтазгодна абапірацца на камунікатыўны метад навучання – мова павінна быць сродкам зносін і ажыццяўляць зносіны, – у аснове якога ляжыць мэта ўсяго навучання мове і кожнага ўрока незалежна ад тэмы: мы вывучаем граматыку, адзінкі мовы, каб карыстацца імі ў паўсядзённых зносінах. Пры такім падыходзе магчыма выкарыстанне наступных прыёмаў: стварэнне маўленчай сітуацыі, правядзенне гутаркі, ролевай гульні, наладжванне экскурсій, паходаў, назіранняў, выкананне пісьмовых і вусных практыкаванняў з рознымі заданнямі, якія стымулююць розныя віды дзейнасці, – усё, што можа выклікаць патрэбу ў выказваннях і зносінах. Напрыклад, дапамагчы сабраць матэрыял для сачынення, апавядання, даклада, артыкула, нататкі ў газету і інш. Калі запатрабуе адукацыйная або развіццёвая задача ўрока, то раскрываецца моўны і лінгвакультуралагічны аспекты вывучэння роднай мовы.

Напрыклад, варыянт маўленчай сітуацыі праз выкарыстанне метаду эксперыменту. Прапануецца наступнае заданне: прачытаць запісанае на картках (карткі з моўнымі адзінкамі, апошнюю, з надпісам „Клён“, не перагортваем) *Maple*, 枫, *ნეკერჩხალი*, *Klevas*, *Lönnlöv*. Уважліва слухаем адказы вучняў. Ставім зваротнае пытанне: чаму ў вас не атрымалася прачытаць? Далей дэманструецца фота з выявай дрэва клён і просьба ўдакладніць, ці сталі больш зразумелымі запісаныя словы. Метад эксперыменту, прыём візуалізацыі і дыялогу дапамагаюць актывізаваць пазнавальную дзейнасць на занятку. Дыялог на занятку з прымяненнем такой маўленчай сітуацыі можа набыць лінгвакультуралагічны і сацыякультурны напрамак, і гэта добра, бо жыхарам Брытанскага архіпелага, кітайцам, грузінам, вандроўнікам з Літвы і Швецыі (іншамоўныя словы пададзены ў адпаведнай паслядоўнасці) цікава даведацца пра архетып клёна ў беларускай культуры [5].

Аднак сітуацыя настаўніка не паляпшаецца, бо малыя беларусы да канца не ўсведамляюць ролі сваёй нацыянальнай мовы ў міжнацыянальных моўных зносінах. Думаецца, што галоўнай задачай настаўніка ў дадзеным выпадку стане данесці вучням тое, што гаварыць па-беларуску, насамрэч, проста, лёгка і варта. Такім чынам, паўстае метадычная праблема: якімі сродкамі (метадамі, прыёмамі, маральна-этычным планам, інтэрактывам і інш.) заахвоціць вучняў да вывучэння роднай мовы і зрабіць іх матывацыю ў навучанні ўстойлівай, узмацніць імпэт да самастойнай пазнавальнай дзейнасці.

Неабходнымі элементамі вучэбнага занятку павінны стаць, па-першае, сітуацыя поспеху, стварэнне спрыяльнай эмацыйнай атмасферы і пахвала са станоўчай ацэнкай (*„У цябе сёння атрымліваецца, таму што…“, „Іменна з гэтым ты справіўся, бо…“, „Усе словы напісаў(-ла) верна, акрамя… На наступны раз будзь больш кемлівым(-ай)“* і інш.). Па-другое, праблемная сітуацыя ці ключавое пытанне да ўрока. Вядома, што цікавасць да працы на вучэбных занятках па прадмеце (на мове вучня гучыць так: *„Тое, што раблю на ўроку…“*) падмацоўваецца пастаянным напружаннем – пошукам новых ведаў, набыццём новых уменняў: *„Тое, пра што яшчэ не ведаю“* і *„тое, што мне спатрэбіцца“*. Па-трэцяе, мэтавызначэнне, або стратэгія ўрока, ад непасрэдных удзельнікаў навучання. Менавіта яны вызначаюць віды сваёй дзейнасці на ўроку, каб дасягнуць мэты і зразумець матэрыял. Па-чацвёртае, адзнака і ацэнка дзейнасці вучня. Яму, вучню, хочацца ведаць, як ацэньваецца яго праца. Настаўніку неабходна памятаць, што адзнака – гэта толькі знак, які сігналізуе аб ступені засвоенасці матэрыялу і выстаўляе арыенціры: вывучаць тэму далей, адпрацаваць уменні ці правесці іх карэкцыю. Не хапае пятага, як у дзіцячай лічылцы, каб „гульня“ пад назвай „Урок“ атрымалася: матэрыял занятку павінен быць важным і важкім для вучня, павінен „зачапіць“ яго ці сваёй надзённасцю, ці асабістай эмацыйнасцю, настраёвасцю, ці тым, што *„я ўмею і люблю, што ў мяне лепш атрымліваецца“*, бо нельга забываць, што ў дзяцей і падлеткаў таксама ёсць вопыт.

Прапануем прыкладны план ўрока беларускай мовы па развіцці маўлення ў VI класе[1] па тэме „Падрабязны пісьмовы пераказ „Клён“ па складаным плане“. На выкананне пісьмовай работы адводзіцца 2 урокі.

Мяркуецца, што 1 — напрыканцы другога ўрока шасцікласнікі выканаюць пісьмовы падрабязны пераказ мастацкага тэксту па складаным плане; 2 — вучні змогуць вылучыць адметнасці складанага плана любога тэксту (вялікія сэнсавыя часткі дзеляцца на меншыя: тэма – мікратэма); 3 — удасканаляць уменне аналізаваць тэкст (вызначаць тэму, ідэю, сэнс загалоўка), што дапаможа скласці план тэксту і напісаць пераказ; 4 — матэрыял урока будзе садзейнічаць развіццю маўленчай і сацыякультурнай кампетэнцыі вучняў.

[1] Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце „Беларуская мова“ для VI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Раздзел „Прыметнік“ (18 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы). Тэма „Складаны план“. Від працы па развіцці маўлення – „Падрабязны пісьмовы пераказ мастацкага тэксту з элементамі апісання рэчаў, жывёл або памяшкання па складаным плане“. Асноўныя патрабаванні да вынікаў дзейнасці вучняў: вусна і пісьмова пераказваць мастацкія тэксты з апісаннем прымет рэчаў, жывёл або памяшкання па складаным плане; складаць апавяданні з апісаннем прымет рэчаў, жывёл або памяшкання.

Абсталяванне: карткі з зыходным тэкстам „Клён“[2], чарнавікі, аркушы з лексічнымі адзінкамі для высвятлення значэння слоў, падбору сінонімаў, удакладнення правапісу.

Тып урока: урок развіцця маўлення.

Ход урока

I. Арганізацыйны момант.

II. Этап актуалізацыі і мэтавызначэння.

- Што аб'ядноўвае паняцці: урок, ручка, план, чарнавік, тэкст?
- Дзе і калі вы напішаце пераказ?
- Чым вы напішаце пераказ?
- Як назавецца пачатковы варыянт вашага пераказу?
- Скажыце, калі ласка, а навошта план?
- Якія віды плана вы ведаеце?
- Як вы думаеце, якая тэма нашых заняткаў?
- Вызначыце задачы да ўрокаў.
- Разгледзьце тэксты на картках і ўдакладніце сваю работу на ўроку.

КЛЁН

На ўсё жыццё запомніўся гэты клён. Калі вясною з'яўлялася зялёная траўка, мы ладзілі каля яго свае гульні. Летам залазілі на самую вяршаліну клёна і спявалі. Захапляліся клёнам восенню, якая шчодра аблівала яго пазалотай.

Памятаю і прыкрае. Вясною мне захацелася кляновага соку. Я ўзяў бацькаву сякеру, слоік і рушыў да клёна. Надсек дрэва, падставіў слоік і пайшоў.

Хутка вярнуўся бацька і ўбачыў паранены клён. Дасталося мне тады на арэхі.

Тата замазаў раны, але яны не зажывалі. Праз год зноў нехта надсек клён. Не шанцавала яму і пасля. Кожны раз я адчуваў сябе вінаватым, быццам зноў раніў дрэва.

А мінулай восенню яго паваліла бура. Я зразумеў, што зрабіў зарубкі не на кляновым, а на сваім целе. І яны пякуць несціханым болем *(Паводле М. Пазнякова)*.

Настаўнік робіць выснову:

– Я дапамагу вам падрыхтавацца да напісання пераказу па складаным плане. Працуем у класе на двух уроках. Па-першае, чытаем тэкст, вызначаем тэму, ідэю, аналізуем загаловак, спрабуем зразумець змест, па-другое, складаем план, па-трэцяе, працуем у чарнавіках, па-чацвёртае, слухаем некалькі варыянтаў, карэкціруем напісанае і толькі потым афармляем у сшытак.

– З чаго пачынаецца работа над пераказам?

– Што вам дапаможа справіцца з гэтай работай?

– Калі і дзе вам спатрэбіцца ўменне пераказваць?

III. Аперацыйна-пошукавы этап. (Вучні па картках сочаць за чытаннем настаўніка, каб адказаць на пытанні па змесце; падкрэсліваюць незразумелыя словы, каб высветліць іх значэнне і потым дарэчна іх ужыць; пазначаюць, напрыклад, зорачкай складаныя для напісання словы, каб правільна іх запісаць. Вучням пра гэта неабходна толькі нагадаць, бо праца з імі ў такім ключы можа ладзіцца з пятага класа, або ўказаць неабходнасць такой работы, калі вучні новыя.)

1. <u>Чытанне тэксту настаўнікам.</u>
2. <u>Гутарка па змесце.</u>

– Чым клён прывабліваў дзяцей?
– Ад якой асобы ідзе гаворка? Гэта хлопчык ці дзяўчынка?
– Якую гісторыю ён вам апавядае?
– Радасны ці горкі гэты ўспамін?
– Як вы зразумелі выраз „дасталося на арэхі“?

(*Этымалагічная даведка.* Дзеці здаўна любілі ласавацца арэхамі, якія каштавалі танна і знаходзіліся проста (не грэцкія, а земляныя, з ляшчыны). Часта бацька, вярнуўшыся з працы ці заробку, даваў дзецям некалькі капейчын на арэхі. Калі ж гарэзы без бацькі дрэнна сябе паводзілі, то маці наракала: „Вось бацька вернецца, будзе вам на арэхі!“ — і дадавала: „Такіх калёных арэхаў усыпле, доўга памятаць будзеце“. Так выраз „на арэхі“ стаў пагрозай пакарання — не дужа жорсткага, але дастаткова адчувальнага).

– Чаму герою балюча праз страту дрэва?
– Што перадае загаловак – тэму ці галоўную думку?
– Падбярыце загаловак, які перадаваў бы галоўную думку.

3. <u>Другое чытанне тэксту</u> (можна падрыхтаваным вучнем). Заданне: вызначыць тып і стыль тэксту, колькасць сэнсавых частак.

– Колькі сэнсавых частак у тэксце? Дайце ім загалоўкі.
– Перачытайце, калі ласка, першы абзац. У чым яго роля?
– Якія апорныя словы і словазлучэнні можна вылучыць у кожнай сэнсавай частцы?
– Як вы думаеце, навошта нам гэта рабіць?

4. <u>Наладжванне зваротнай сувязі</u>:

- Успомніце пастаўленыя вамі задачы да ўрока.
- Ці зможаце вы зараз паспяхова выканаць пераказ? Чаму?
- Што засталося нявысветленым ці нязробленым?

5. <u>Складанне плана</u>. Вучням прапануецца скласці план на чарнавіках, працуючы ў парах. Даецца магчымасць паслухаць 2–3 варыянты. Далей — праверка па эталоне. Калі вучні выказваюць сапраўды слушныя сподумкі, узнікае патрэба ў карэкціроўцы эталона.

План

1. Прывабны клён.

[2]Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя пераказы: 5–9 класы: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск: Аверсэв, 2012. – 219 с. – (Кантрольна-вымяральныя матэрыялы).

2. Горкія ўспаміны.

А) Кляновы сок.

Б) Дасталося на арэхі.

В) Раны на дрэве.

3. Несціханы боль.

Наладжваецца работа па вусным пераказе сэнсавых частак.

6. Слоўнікавая работа.

На дошку прымацоўваюцца:

- аркушы са словамі *вяршаліна, кляновага соку, падставіў слоік, надсек, восенню, зарубкі, несціханым.* Вучні тлумачаць арфаграмы[3];
- аркушы са словамі „прыкра“, „рушыць“ для асэнсавання іх значэння і пашырэння слоўніка вучняў[4];
- лінгвістычны эксперымент: на дошцы задача, якую трэба рашыць.

| |
|---|
| Бярозавік – рус. берёзовый сок,<br>… ? … – рус. кленовый сок. |

– Знайдзіце ў тэксце сказ са словазлучэннем „кляновы сок“, перабудуйце яго, замяніўшы „кляновы сок“ на *кляновік*, і прачытайце тое, што атрымалася. Звярніце ўвагу і на назву пункта 2А нашага плана. Паўтарыце яшчэ раз.

7. Аналіз складаных сказаў.

– Што вам трэба памятаць, каб правільна пабудаваць і запісаць сказ? (Адказы вучняў)

– Знайдзіце ў тэксце складаныя сказы. У парах пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку[5].

*(Калі вясною з'яўлялася зялёная траўка, мы ладзілі каля яго свае гульні.Захапляліся клёнам восенню, якая шчодра аблівала яго пазалотай. Тата замазаў раны, але яны не зажывалі. Кожны раз я адчуваў сябе вінаватым, быццам зноў раніў дрэва. Я зразумеў, што зрабіў зарубкі не на кляновым, а на сваім целе.)*

8. Наладжванне зваротнай сувязі.

– Скажыце, а цяпер вы можаце справіцца з пераказам?

– Якія выкананыя заданні вам дапамогуць? (Вучні пералічваюць віды дзейнасці, у якую былі ўключаны: чытанне і слуханне тэксту, аналіз зместу, выбар ключавых слоў і словазлучэнняў, складанне плана, арфаграфічны і сінтаксічны разбор і інш.)

9. Настаўнік збірае карткі з тэкстам.

V. Чытанне чарнавых варыянтаў (2–3 вучні) для карэкціроўкі зместу (калі трэба, звярнуцца да плана і ключавых слоў, словазлучэнняў), моўнага афармлення (пазбягаць паўтораў, ужывання рускіх слоў), арфаграфічных і граматычных хібаў.

VI. Індывідуальная праца ў сшытках[6].

Арганізаваная работа па навучанні пераказу на ўроках беларускай мовы ў VI–VII класах дае магчымасць вучням, па-першае, адчуваць сябе больш спакойна, нязмушана. Па-другое, яны разумеюць і адсочваюць на працягу ўрока ход сваёй дзейнасці, пры гэтым бачаць канчатковы вынік у выглядзе самастойнай пісьмовай работы. Па-трэцяе, зыходны тэкст перад вачыма надае ўпэўненасці, нават смеласці, адкрытасці ва ўзаемадзеянні з настаўнікам[7]. Па-чацвёртае, выкарыстанне метаду і прыёмаў візуалізацыі павышае матывацыю вучняў да навучання[8]. Па-пятае, такія формы работы з тэкстам, як пісьмовая і вусная, слоўнікавая і лексічная, ствараюць умовы для шматразовага ўзнаўлення гісторыі, перададзенай у тэксце, а значыць, садзейнічаюць поўнай і граматнай перадачы зместу тэксту. Урок пэўным чынам становіцца гульнёй, у ходзе якой трэба набраць больш балаў, для чаго неабходна запомніць многа слоў, словазлучэнняў, цэлых сказаў, не парушыць будовы тэксту, пакінуць без змен колькасць яго сэнсавых частак. Вучні „гуляюць па правілах“, якія агучвае настаўнік, і „правілы“ павінны быць зразумелымі, прымальнымі, аднолькавымі як для настаўніка, так і для вучня.

## Спіс літаратуры

1. Аб зацвярджэнні адукацыйных стандартаў агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс]: пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 26.12.2018, № 125 // Нацыянальны адукацыйны партал. — Рэжым доступу: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. — Дата доступу: 20.08.2021.

2. Колас, Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 15. П'есы. Метадычныя распрацоўкі / Якуб Колас; рэд. тома Т. С. Голуб; падрыхт. тэкстаў і камент. А. І. Шамякінай; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. — Мінск: Беларус. навука, 2011. — 791 с.

3. Методыка выкладання беларускай мовы: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. Адукацыі / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. — Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. —

[3]Арфаграфічны навык напісання прыставак на зычны, правапісу зычных, падоўжаных зычных, е, ё, я і правапісу канчатка **–у** ў форме роднага склону назоўнікаў 2-га скланення замацоўваўся на працягу двух тыдняў.

[4]Прыкра — непрыемна, пакутна, цяжка, крыўдна, агідна. Рушыць — накіравацца, адправіцца, ісці, рухацца, прасоўвацца, прабірацца, сунуцца, шкандыбаць, прадзірацца.

[5]Трэба запытацца ў 2–3 пар. Настаўнік пры неабходнасці дае правільны варыянт.

[6]Сшыткі збіраюцца ў канцы другога ўрока.

[7]Апісанай камунікатыўнай сітуацыі характэрны сучасны псіхолага-педагагічны падыход, які заключаецца ў тым, што настаўнік паказвае тэкст вучням, чытае тэкст разам з імі, наладжвае паўнавартаснае ўзаемадзеянне з вучнямі, давярае ім і суправаджае іх дзейнасць. Параўнайце працу вучняў на ўсіх этапах урока з прымяненнем такога падыходу і працу вучняў на традыцыйным уроку па навучанні напісанню пераказу.

[8]Надрукаваны тэкст, у якім правільна напісаны словы і пастаўлены знакі прыпынку, абазначаны абзацы, граматна пабудаваныя сказы і інш., з'яўляецца аб'ектам візуалізацыі.

с. 358—396.
4. Швед, І.А. Сімволіка дзікарослых дрэў у беларускім фальклоры [Электронны рэсурс] / І.А. Швед // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. — 2007. — № 1. — С. 3–7. — Рэжым доступу: elib.bsu.by/shved3-7.pdf. — Дата доступу: 03.08.2021.

# ИЗУЧЕНИЕ ТЕМЫ «МАЛЫЕ ТЕЛА СОЛНЕЧНОЙ СИСТЕМЫ» В РАМКАХ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА «ЧЕЛОВЕК И МИР» В V КЛАССЕ

Кузнецова Надежда Викторовна

***Аннотация.*** *В статье предложена подробная методическая разработка сценария урока «Малые тела Солнечной системы» по учебному предмету «Человек и мир» в V классе, подготовленного учителем-практиком. Представленный урок разработан с учётом современных требований. В нём чётко очерчены место урока в учебном курсе, цель, задачи; дан перечень оборудования, которое понадобится на данном уроке; предложены основные структурные этапы хода урока. Материал статьи представлен в виде развёрнутого плана-конспекта с элементами анализа и прогнозирования деятельности учителя и ученика на основных этапах урока.*

*Каждый этап урока автор предваряет обоснованием его методической целесообразности. Также в статье для каждого этапа урока предлагается описание приёмов и методов, обеспечивающих эффективность образовательной деятельности, даются объяснения по их применению, перечень учебных заданий, использование которых позволяет контролировать процесс усвоения изучаемого материала, предлагаются рекомендации по использованию определённых форм и видов организации работы обучающихся.*

Учебный предмет «Человек и мир» интегрирует в себе пропедевтические знания по таким предметам, как «География», «Биология», «Обществоведение», «Химия», «Физика», «Астрономия». Целью изучения учебного предмета «Человек и мир» является формирование у учащихся целостного взгляда на окружающий мир, способности взаимодействовать с ним гармонично и ответственно.

В дополнение к знаниям, которые учащиеся получают в результате изучения учебного предмета «Человек и мир», они также осваивают ряд общеучебных умений: как проводить наблюдение и эксперимент, описывать объекты, выявлять и устанавливать причинно-следственные связи, составлять прогноз, давать оценку каких-либо действий, обнаруживать и решать проблему, работать с картами.

В V классе учащимся в силу возраста тяжело запомнить большой объём теоретических знаний, поэтому наряду с уроками, имеющими традиционную структуру, актуальными являются уроки, включающие элементы нетрадиционных урочных учебных занятий, а также в полной мере нетрадиционные уроки. Современная система образования стала более интерактивной, появилось много интересных подходов к обучению детей, что позволяет сделать образовательный процесс разнообразным и увлекательным.

Раздел I учебного предмета «Человек и мир» в V классе имеет название «Земля и Вселенная». Изучение космоса всегда актуально. Человек добился значительных результатов в исследовании космического пространства, однако многое еще остаётся непознанным. Учащихся привлекает изучение космоса в силу своей загадочности, таинственности, многомерности. Они готовы долго говорить о космическом пространстве, рассуждать, выдвигать теории, спорить. Многие учащиеся с удовольствием выполняют опережающие и дополнительные задания, связанные с тайнами Вселенной.

Тема «Малые тела Солнечной системы», входящая в состав раздела I «Земля и Вселенная», важна и не должна затеряться среди других. Кометы, астероиды, метеоры, метеориты не просто увлекательные далёкие объекты: они скрывают таинство создания мира и могут быть опасны для нашей планеты. Учащиеся должны иметь представление об астероидах, кометах, метеорах и метеоритах, называть их сходства и различия, понимать и объяснять образование малых тел Солнечной системы.

Предлагаем план-конспект урока, который можно использовать для проведения занятий в учреждениях общего среднего образования.

Тип урока: урок изучения нового материала.

Цель урока — сформировать представления о малых небесных телах, умения их сравнивать и определять различия между ними.

Задачи:

- познакомить учащихся с различными малыми небесными телами;